**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па гуманітарнай адукацыі

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік
міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________ І.А. Старавойтава
__________________2019 г.
Рэгістрацыйны № ТД-________/тып.

# ТЭОРЫЯ І МЕТОДЫКА МУЗЕЙНАЙ СПРАВЫ

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці:**
**1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках).**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення культуры і
народнай творчасці Міністэрства
культуры Рэспублікі Беларусь
_____________Н.І. Задзяркоўская
_______________________ 2019 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення прафесійнай
адукацыі Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_______________С.А.Каспяровіч
_____________________ 2019 г.

**УЗГОДНЕНА**
Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання па гуманітарнай адукацыі
____________________ С.М. Ходзін
_____________________ 2019 г.

**УЗГОДНЕНА**
Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі
“Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы”
__________________І.У. Цітовіч
___________________ 2019 г.

Эксперт-нормакантралёр
______________________________
___________________ 2019 г.

Мінск 2019

**СКЛАДАЛЬНІК:**

А.А. Гужалоўскі, прафесар кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар;

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”;

С.П. Віцязь, намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”, доктар гістарычных навук.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**

Кафедрай этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 1 ад 30 жніўня 2019 г.);

Навукова-метадычным саветом Беларускага дзяржаўнага універсітэта
(пратакол № 1 ад 25 верасня 2019 г.);

Навукова-метадычным саветам па гістарычным навукам і тэалогіі вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі
(пратакол № 3 ад 3 верасня 2019 г.).

Адказны за рэдакцыю: А.А. Гужалоўскі

Адказны за выпуск: А.А. Гужалоўскі

**Змест**

1. Тлумачальная запіска ……………………………………………..4

2. Прыкладны тэматычны план……………………………………......8

3. Змест вучэбнага матэрыяла……………………………….………10

4. Инфармацыйна-метадычная частка……………….…………….. 16

## 1. Тлумачальная запіска

Тыпавая вучэбная праграма новага пакалення па вучэбнай дысцыплне "Тэорыя і методыка музейнай справы" для спецыяльнасці: 1-23 01 12 "Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках)" прызначана для кіраўніцтва ў сваёй дзейнасці выкладчыка і студэнта. Адметнымі асаблівасцямі дадзенай тыпавой вучэбнай праграмы з'яўляюцца: абноўлены змест, акцэнтацыя на кампетэнтнасным падыходзе ў навучанні, значнае ўзмацненне ролі і долі самастойнай работы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У рамках сумеснага супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым "навігатарам" набыцця ведаў, інфармацыйных і практыкаарыентаваных жыццядзейных уменняў.

Вучэбная праграма дысцыпліны "Тэорыя і методыка музейнай справы" распрацавана ў адпаведнасці з агульнаадукацыйным стандартам вышэйшай адукацып першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 "Музейная справа і ахова-гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках)".

Дысцыпліна "Тэорыя і методыка музейнай справы" звязана з вучэбнымі дысцыплінамі, якія вывучацца на першым і другім курсах. Вывучэнне тэорыі і методыкі музейнай справы базуецца на вывучэнні курсаў "Гісторыя музейнай справы", "Гісторыя матэрыяльнай культуры", "Тэорыя і гісторыя культуры", "Гісторыя Беларусі". Вывучэнне гэтых дысцыплін фармуе ў студэнтаў уяўленне пра гісторыка-культурныя працэсы на тэрыторыі Беларусі і ў свеце, што дазваляе ў рамках курса сфармаваць уяўленне пра заканамернасці і асаблівасці развіцця музея як сацыяльнага інстытута, уменне вылучаць заканамернае і ўнікальнае ў працэсах захавання і інтэрпрэтацыі прыроднай і культурнай спадчыны.

### Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны "Тэорыя і методыка музейнай справы"

**Асноўная мэта выкладання дысцыпліны:**

• стварэнне ў студэнтаў фундамента музеалагічных ведаў на падставе вывучэння дасягненняў сусветнай і айчыннай музейнай тэрыі і практыкі.

**Задачы вывучэння дысцыпліны:**

• даць студэнтам глыбокія веды тэарэтычных асноў музеялогіі, выдзяляючы яе спецыфіку, раскрываючы прынцыпы суадносінаў метадалогіі і метадаў пазнання сусвету праз прыродную і культурную спадчыну;

• даць студэнтам сістэмныя веды аб музейнай культуры і сучасных тэндэнцыях развіцця музеяў свету;

• пазнаёміць з асноўнымі накірункамі развіцця музеяў Беларусі, прадэманстраваць іх асаблівасці ва ўсходнеславянскім і агульнаеўрапейскім кантэксце.

• сфармаваць у студэнтаў навукова-даследчыя і практычныя навыкі;

• садзейнічаць падрыхтоўцы шырока адукаваных, творчых, з крытычным мысленнем спецыялістаў, здольных да аналізу і прагназавання складаных музейных працэсаў і авалоданню методыкай правядзення музеалагічных даследаванняў.

**У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен ведаць:**

- структуру, асноўныя паняцці і тэрміны музеялогіі;
- тэарэтычныя і метадычныя аспекты камплектавання, захавання, уліку і вывучэння фондавых калекцый;
- тэарэтычныя і метадычныя аспекты праекціравання экспазіцый і культурна-адукацыйнай дзейнасці музея;
- арганізацыю сучаснай дзейнасці музея.

**студэнт павінен умець:**

- выкарыстаўваць асноўныя паняцці, тэрміны, навыкі і фактычны матэрыял па музеялогіі ў тэарэтычнай, метадычнай і практычнай музейнай дзейнасці;
- аналізаваць крыніцы па сучаснаму стану музейнай справы Беларусі;
- даць характарыстыку сучаснага стану музеяў, музейнага фонда і нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;
- вызначаць пагрозы існавання музеяў і музейнага фонду РБ;
- ужываць у практычнай рабоце юрыдычна-прававую базу дзейнасці музеяў РБ.

**студэнт павінен валодаць:**

- найноушымі метадалагічнымі канцэпцыямі ў галіне музеялогіі;
- актуальнымі метадалагічнымі прыемамі аналіза музейных феноменаў і музейных працэсаў;
- метадамі збору эмпірычнага матэрыяла для правядзення музеалагічнага даследавання;
- асноунымі прыёмамі аналізу культурных працэсаў у сучасным свеце.

**Агульныя патрабаванні да фарміравання сацыяльна-асобасных кампетэнцый выпускніка**

**Асноўнымі мэтамі** сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў у ВНУ выступаюць фарміраванне і развіццё сацыяльна-асобасных кампетэнцый, заснаваных на гуманітарных ведах, эмацыйна-каштоўнасным і сацыяльна-творчым вопыце і якія забяспечваюць рашэнне і выкананне грамадзянскіх, сацыяльна-прафесійных, асобасных задач і функцый.

Сфармаванасць у выпускніка сацыяльна-асобасных кампетэнцый спрыяюць развіццю сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці як інтэграванага выніку адукацыі ў ВНУ.

Агульныя патрабаванні да фармавання сацыяльна-асобасных кампетэнцый выпускніка вызначаюцца наступнымі прынцыпамі:

**прынцып гуманізацыі** як прыярытэтны прынцып адукацыі, які забяспечвае асобасна-арыентаваны характар адукацыйнага працэса і творчую самарэалізацыю выпускніка;

**прынцып фундаменталізацыі**, які спрыяе арыентацыі зместа дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла на выяўленне сутнасных асноў і сувязей паміж разнастайнымі працэсамі акаляючага свету, прыродазнаўчанавуковымі і гуманітарнымі ведамі;

**прынцып кампетэнтнаснага падыходу**, які вызначае сістэму патрабаванняў да арганізацыі адукацыйнага працэса, якія накіраваны на ўзмацненне яго практыкаарыентаванасці, павышэнне ролі самастойнай працы студэнтаў па вырашэнню задач і сітуацый, якія мадэлююць сацыяльна-прафесійныя праблемы, і фармаванне ў выпускнікоў здольнасці дейнічаць у змяняючыхся жыццёвых умовах;

**прынцып сацыяльна-асобаснай падрыхтоўкі**, які забяспечвае фармаванне ў студэнтаў сацыяльна-асобаснай кампетэнтнасці, заснаванай на адзінстве набытых гуманітарных ведаў і ўменняў, эмацыянальна-каштоўнасных адносінаў і сацыяльна-творчага вопыту з улікам інтарэсаў, патрэбаў і магчымасцей навучэнцаў;

**прынцып міждысцыплінарнасці і інэгратыўнасці сацыяльна-гуманітарнай адукацыі**, рэалізацыя якога забяспечвае цэласнасць вывучэння гуманітарных ведаў і іх узаемасувязь з сацыяльным кантэкстам будучай прафесійнай дзейнасці выпускніка.

У адпаведнасці з гэтымі мэтамі і прынцыпамі сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі выпускнік вышэйшай навучальнай установы пры падрыхтоўцы

па адукацыйнай праграме першай ступені павінен набыць наступныя сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:

• **АК-3.** Спецыяліст павінен валодаць даследчымі навыкамі і умець ужываць навукова-тэарэтычныя веды для рашэння практычных задач;

• **САК-1.** Вывучэнне дысцыпліны садзейнічае фармаванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў выпускнікоў, адказнасці за захаванне і трансляцыю нацыянальнай прыроднай і культурнай спадчыны;

• **ПК-12.** Спецыяліст павінен умець фармуляваць і вырашаць задачы, якія ўзнікаюць падчас даследніцкай дзейнасці, планаваць і арганізоўваць музейную і помнікаахоўную работу.

Структураванне зместа вучэбнай дысцыпліны здзяйсняецца праз выдзяленне ў ім узбуйненных дыдактычных адзінак (модуль, раздзел) і уключае:

• уводзіны ў дысцыпліну;
• модулі (раздзелы);
• тэмы вучэбных заняткаў;

• заключэнне.

На вывучэнне дысцыпліны “Тэорыя і методыка музейнай справы” у адпаведнасці з агульнаадукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 12 “Музейная справа і ахова-гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках)” адводзіцца 198 гадзін. З іх 90 гадзін – аўдыторныя заняткі, 108 гадзін – самастойная работа студэнтаў. Прыкладнае размеркаванне аудыторных заняткау – 54 гадзіны лекцый і 36 гадзін семінарск1х заняткаў. Аб’ём курса – 5 заліковых адзінак. Рэкамендуемыя формы атэстацыі студэнтаў – залік і экзамен.

## 2. Прыкладны тэматычны план.
## Спецыяльнасць 1-21 03 01 гісторыя (па напрамках) і 1-23 01 12 музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны ( па напрамках);

| Семестр | Назва модуля | Усяго | Агульная колькасць аўдыторных гадзін | У тым ліку | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Лекцыі | Семінарскія заняткі |
| I. | 1. Захаванне і вывучэнне ў музеях прыроднай і культурнай спадчыны | 98 | 46 | 26 | 20 |
| | 1.1 Агульная характарыстыка музея як сацыяльна-культурнага інстытута, яго функцыі і важнейшыя напрамкі дзейнасці. | 32 | 16 | 8 | 8 |
| | 1.2 Помнікі гісторыі і культуры, іх класіфікацыя і формы выкарыстання. Музейны прадмет у структуры музейных фондаў. | 22 | 10 | 6 | 4 |
| | 1.3 Камплектаванне, улік і захаванне музейных фондаў. | 22 | 10 | 6 | 4 |
| | 1.4 Вывучэнне музейных калекцый. | 22 | 10 | 6 | 4 |
| II | 2. Выкарыстанне ў музеях прыроднай і культурнай спадчыны | 100 | 44 | 28 | 16 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2.1 Сучасная музейная экспазіцыя – сінтэз навукі і мастацтва. | 28 | 12 | 8 | 4 |
| | 2.2 Навуковыя асновы праекціравання экспазіцый і выставак. | 28 | 12 | 8 | 4 |
| | 2.3 Музей у сістэме культурна-адукацыйнай работы. | 28 | 12 | 8 | 4 |
| | 2.4 Актуальныя пытанні сучаснай музеялогіі. | 16 | 8 | 4 | 4 |
| | Усяго: | 198 | 90 | 54 | 36 |

## 3. Змест вучэбнага матэрыяла.

## ЗАХАВАННЕ І ВЫВУЧЭННЕ Ў МУЗЕЯХ ПРЫРОДНАЙ І КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

### Модуль I. Агульная характарыстыка музея як сацыяльна-культурнага інстытута, яго функцыі і важнейшыя напрамкі дзейнасці.

Уводзіны. Паняцце аб музеі. Характарыстыка музея як навукова-даследчай і навукова-асветніцкай установы. Сацыяльныя функцыі музеяў. Асноўныя мэты і задачы музеяў. Формы рэалізацыі музеямі сацыяльных функцый. Музей як камунікатыўная сістэма. Паняцце аб музейнай камунікацыі. Класіфікацыя музеяў. Профіль музеяў. Віды музейных устаноў. Грамадскія сувязі музеяў. Іх роля і значэнне для функцыяніравання музея як сацыяльна-культурнага інстытута. Музей і сродкі масавых камунікацый. Фактары развіцця музея.

Сутнасць навукова-даследчай работы ва ўмовах музея. Характарыстыка асноўных напрамкаў навуковых даследванняў у музейных установах. Даследаванні, якія праводзяць музеі ў галіне профільных дысцыплін. Арганізацыя і планіраванне навукова-даследчай работы ў музеях. Каардынацыя навуковай работы музеяў з іншымі навуковымі ўстановамі, ВНУ, архівамі. Мэты, задачы і формы сумеснай даследчыцкай дзейнасці музеяў з установамі-партнёрамі.

Навуковая канцэпцыя музея – аргументаванае вызначэнне мэтаў і задач яго развіцця, форм і метадаў музейнай дзейнасці. Развіццё паняцця “навуковая канцэпцыя музея” у музеялогіі. Распрацоўка навуковай канцэпцыі музея як накірунак навукова-даследчай дзейнасці музея. Міждысцыплінарны характар разработкі навуковай канцэпцыі музея. Найважнейшыя этапы разработкі навуковай канцэпцыі музея – падрыхтоўка і аналіз зыходных дадзеных, разработка агульнай задумы музея, складанне генеральнага плану развіцця музея і іх характарыстыка. Арганізацыя работы па выпрацоўцы навуковай канцэпцыі музея.

### Модуль 2. Помнікі гісторыі і культуры, іх класіфікацыя і формы выкарыстання. Музейны прадмет у структуры музейных фондаў.

Вызначэнне паняццяў “помнік”, “помнік гісторыі і культуры”. Класіфікацыя помнікаў. Тыпы і віды помнікаў. Функцыі помнікаў прыроды,

гісторыі і культуры. Асноўныя напрамкі выкарыстання помнікаў. Формы і метады выкарыстання помнікаў у розных галінах чалавечай дзейнасці. Непрадметныя формы гісторыка-культурнай спадчыны.

Вызначэнне паняццяў "прадмет музейнага значэння", "музейны прадмет". Значэнне музейных прадметаў у рэалізацыі асноўных накірункаў дзейнасці музейных устаноў. Музейны прадмет як першакрыніца ведаў. Музейны прадмет як сродак выхавальніцкага ўздзеяння. Класіфікацыя музейных прадметаў. Тыпы і віды музейных прадметаў. Інфармацыйныя свойствы музейных прадметаў. Метады раскрыцця інфармацыйнага патэнцыялу музейных прадметаў.

Фонды музея як сукупнасць музейных прадметаў асноўнага і навукова-дапаможнага фондаў. Структура і склад музейных фондаў. Паняцце аб музейнай калекцыі. Віды музейных калекцый. Значэнне музейнай калекцыі ў дзейнасці музея. Магчымасці выкарыстання музейных збораў як крынічнай базы  профільных навуковых дысцыплін. Музейныя калекцыі як складаная частка Дзяржаўнага музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Музейны фонд Рэспублікі Беларусь: гісторыя, статус, структура, функцыі, арганізацыя.

**Модуль 3. Камплектаванне, улік і захаванне музейных фондаў.**

Музейная функцыя дакуменціравання і яе рэалізацыя ў працэсе фарміравання музейнага збору. Гістарыяграфія праблемы камплектавання музейных збораў. Мэты і задачы камплектавання музейных фондаў. Паняцце аб навуковам камплектаванні калекцый музея. Навуковае камплектаванне фондаў як элемент навуковай канцэпцыі музея. Аб'екты і крыніцы камплектавання. Вывучэнне асяроддзя бытавання прадметаў музейнага значэння. Дакументы камплектавання музейных калекцый (палявыя вопісы, дзённікі, акты прыёму, калекцыйныя вопісы) і асноўныя патрабаванні, якія прад'яўляюцца да іх. Дзейнасць фондавай камісіі. Асаблівасці камплектавання, накіраванага на адлюстраванне сучасных працэсаў (актуальнага дакументавання эпохі). Пытанні міжмузейнай каардынацыі камплектавання фондаў.

Улік музейных прадметаў як форма юрыдычнай аховы фондаў і ўмовы рэалізацыі ўсіх накірункаў дзейнасці музея. Дзеючыя інструкцыі па пытаннях ўліку музейных фондаў. Асноўныя этапы ўліку фондаў. Патрабавнні якія прад'яўляюцца да ўліковай дакументацыі. Патрабаванні да арганізацыі ўліку музейных прадметаў з каштоўных металаў і камянёў.

Задачы захавання музейных прадметаў. Паняцце аб сістэме захавання музейных фондаў і рэжым захавання музейных калекцый. Фактары, якія ўплываюць на захаванасць помнікаў гісторыі і культуры. Дзеючыя інструкцыі па пытаннях захавання музейных прадметаў у фондасховішчах і экспазіцыях. Прафілактыка захавання. Найважнейшыя патрабаванні да будынкаў музеяў і фондасховішчаў і іх тэхнічнаму аснашчэнню. Асноўныя тыпы і віды фондавага абсталявання. Рэжым захоўвання асобных відаў музейных прадметаў. Паняцце аб кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры.

**Модуль 4. Вывучэнне музейных калекцый.**

Вывучэнне музейных фондаў і яго значэнне для ўсіх напрамкаў дзейнасці музея. Паняцце аб інфармацыйным патэнцыяле музейнага прадмета. Прыёмы раскрыцця інфармацыйнага патэнцыялу. Асноўныя этапы вывучэння музейнага прадмета – атрыбуцыя, класіфікацыя, сістэматызацыя, інтэрпрэтацыя і іх характарыстыка. Важнейшыя патрабаванні да фіксацыі, вынікаў вывучэння музейных калекцый (аўтаматызаваная музейная ўлікова-фондавая сістэма АМС-5).

Важнейшыя напрамкі навуковага выкарыстання музейных калекцый з мэтай развіцця навукі, культуры, адукацыі, удасканальвання адукацыйна-выхаваўчай працы. Задачы рацыянальнага выкарыстання вынікаў даследавання музейных калекцый. Патрабаванні да арганізацыі працы даследчыкаў у фондасховішчах музеяў. Месца і значэнне навукова-даведачнага апарата музея. Картачныя каталогі і картатэкі як гістарычна склаўшаяся форма навукова-даведачнага апарата. Патрабаванні да каталогаў і картатэк. Друкаваныя каталогі, іх функцыі і характарыстыка. Выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій для ўдасканальвання навукова-даведачнага апарата музеяў.

## ПРЭЗЕНТАЦЫЯ Ў МУЗЕЯХ ПРЫРОДНАЙ І КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

**Модуль 1. Сучасная музейная экспазіцыя – сінтэз навукі і мастацтва.**

Галоўныя этапы развіцця экспазіцыйнай думкі. Мэты і задачы музейнай экспазіцыі. Музейная экспазіцыя і музейная камунікацыя.

Музейная экспазіцыя як спецыфічная форма публікацый музейнага збору і вынікаў вывучэння музейных прадметаў. Найважнейшыя патрабаванні да экспазіцыі з пазіцыі навуковага зместу, архітэктурна-мастацкага вырашэння і псіхалагічных асаблівасцей успрымання наведвальнікаў.

Агульная характарыстыка і спецыфічныя асаблівасці сістэматычнай, тэматычнай і ансаблевай экспазіцыі. Сюжэтна-вобразны метад. Гісторыка-храналагічны, комплексна-тэматычны і праблемны прынцыпы праектавання экспазіцыі, магчымасці іх выкарыстання ў экспазіцыйнай рабоце. Роля тэматыка-экспазіцыйнага комплекса ў структуры тэматычнай экспазіцыі.

Значэнне архітэктурна-мастацкага праектавання музея і экспазіцыі для павышэння якасці вынікаў музейнай дзейнасці. Сучасныя патрабаванні да абсталявання і архітэктурна-мастацкага вырашэння музейнай экспазіцыі. Задачы мастацкага праектавання музейнай экспазіцыі. Метады ўзаемадзеяння навуковага супрацоўніка-экспазіцыянера і мастака ў працэсе стварэння экспазіцыі. Музейная экспазіцыя ў сістэме адукацыйна-выхаваўчай дзейнасці. Музейная экспазіцыя і музейная педагогіка.

## Модуль 2. Навуковыя асновы праекціравання экспазіцый і выставак.

Задачы навуковага праекціравання экспазіцыі. Музейная экспазіцыя і музейная камунікацыя. Асноўныя этапы праекціравання экспазіцыі і іх характарыстыка. Навуковая канцэпцыя экспазіцыі. Яе значэнне ў працэсе работы над новым экспазіцыйным рашэннем. Асноўныя патрабаванні да навуковай канцэпцыі экспазіцыі. Навуковая канцэпцыя і крыніцазнаўчая база экспазіцыі. Выкарыстанне ў экспазіцыі дасягненняў профільных навуковых дысцыплін.

Тэматычная структура экспазіцыі. Патрабаванні, якія прад’яўляюцца да тэматыка-экспазіцыйнага плана. Роля і месца ў экспазіцыі асноўных відаў экспазіцыйных матэрыялаў – музейных прадметаў, копій, муляжоў, навукова-дапаможных матэрыялаў, тэкстаў. Патрабаванні да тэкстаў ў экспазіцыі. Класіфікацыя тэкстаў. Спецыфічныя функцыі ў экспазіцыі аўдыевізуальных сродкаў, межы і ўмовы іх выкарыстання.

Магчымасці і межы выкарыстання нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ў музейнаых мэтах. Асноўныя накірункі выкарыстання помнікаў у сістэме экспазіцыйнай дзейнасці. Спецыфіка стварэння мемарыяльных экспазіцый, размешчаных у будынках-помніках. Гісторыка-культурнае асяроддзе і прыродны ландшафт як аб'екты экспазіцыйнай дзейнасці.

Мэты і задачы выставачнай дзейнасці. Спецыфіка выстаўкі як формы экспазіцыйнай работы музея. Тыпы і віды выставак. Выстаўка як эксперыментальная база пабудовы экспазіцыі. Задачы каардынацыі выставачнай работы музеяў на рэгіянальным і агульнадзяржаўным узроўні.

**Модуль 3. Музей у сістэме культурна-адукацыйнай работы.**

Адукацыйна-выхаваўчая функцыя музеяў і яе рэалізацыя. Асноўныя этапы развіцця навукова-асветніцкай работы музеяў. Узаемасувязь навукова-асветніцкай работы музея з усімі напрамкамі яго дзейнасці. Вядучыя прынцыпы навукова-асветніцкай работы музеяў. Псіхалагічна-педагагічныя асновы выхаваўчага ўздзеяння музеяў. Паняцце аб музейнай педагогіцы. Задачы каардынацыі выхаваўчай работы музеяў з установамі культуры, асветы і іншымі музеямі. Адукацыйна-выхаваўчая работа музеяў і арганізацыя вольнага часу насельніцтва. Музеі і турызм.

Прынцыпы культурна-адукацыйнай работы музеяў і яе асноўныя формы. Класіфікацыя відаў культурна-адукацыйнай работы. Экскурсіі і іх пазнавальнае значэнне. Класіфікацыя экскурсій. Характарыстыка асноўных відаў экскурсій (аглядныя, тэматычныя, тэатральныя і г.д.). Методыка падрыхтоўкі і правядзення экскурсій. Музейныя лекцыі і іх спецыфіка. Клубныя формы навукова-асветніцкай работы музеяў (музейныя святы, дні спецыялізаванага абслугоўвання, тэматычныя тыдні) і іх характарыстыка. Арганізацыя і правядзенне алімпіяд, канферэнцый, фестываляў, краязнаўчых злётаў, сустрэч, конкурсаў. Спецыфіка правядзення гэтых мерапрыемстваў музеямі. Пазамузейныя формы культурна-адукацыйнай работы. Формы і метады выхавання ў наведвальнікаў музейнай культуры.

Задачы вывучэння музейнай аўдыторыі. Музейная аўдыторыя як аб'ект музеялагічнага даследавання. Асаблівасці вывучэння наведвальнікаў музейных установаў сацыялагічнымі метадамі. Асноўныя працэдуры сацыялагічнага даследавання. Паняцце аб рэпрэзэнтатыўнасці вынікаў сацыялагічных даследаванняў. Даследаванне працэса ўспрымання наведвальнікамі экспазіцый і розных форм навукова-асветніцкай работы.

**Модуль 4. Актуальныя пытанні сучаснай музеялогіі.**

Шляхі павышэння ролі музеяў у сацыяльна-эканамічнам і духоўным развіцці грамадства. Тэндэнцыі развіцця сацыяльных функцый музеяў. Новыя сферы камплектавання музейных калекцый. Пераасэнсаванне крытэрыяў адбору помнікаў гісторыі і культуры ў музейныя зборы. Перспектывы выкарыстання інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у розных галінах музейнай дзейнасці. Музеі і Інтэрнэт. Удасканальванне метадаў раскрыцця інфармацыйнага матэрыялу музейнага прадмета. Распрацоўка пытанняў музейнага крыніцазнаўства. Музейная экспазіцыя і сучасныя камунікацыйныя мадэлі. Музейны менеджмент і маркецінг. Псіхолага-педагагічныя праблемы культурна-адукацыйнай работы музеяў. Распрацоўка пытанняў музейнай педагогікі. Новыя методыкі сацыялагічных даследаванняў у музеях. Навуковае забеспячэнне органаў кіравання музейнай справай. Акрэдытацыйныя стандарты музеяў. Распрацоўка даўгатэрміновых, мэтавых, комплексных праграм музейнага будаўніцтва. Распрацоўка перспектыўных мадэляў музейных устаноў. Тэарэтычныя асновы развіцця музейнай сеткі. Стварэнне сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі музейных кадраў. Падрыхтоўка тэарэтычных прац, навучальных дапаможнікаў, вучэбных праграм па музеялогіі.

## 4. Інфармацыйна-метадычная частка

Па кожным вучэбным модулі (раздзеле) у адпаведнасці з яго мэтамі і задачамі па фармаванню і развіццю ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі. У ліку найбольш перспектыўных і эфектыўных сучасных інавацыйных адукацыйных сістэм і тэхналогій, якія дазваляюць рэалізаваць сістэмна-дзейнасны кампетэнтнасны падыход у навучальна-выхаваўчым працэсе, трэба вылучыць: вучэбна-метадычныя комплексы; варыятыўныя мадэлі самастойнай працы студэнтаў, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, методыкі актыўнага навучання.

За аснову структуры тыпавой праграмы ўзяты модуль, які ўяўляе сабой узбуйненую і цэласную дыдактычную адзінку працэса навучання і зместа, які мае адносна завершаны характар.

**Рэкамендаваныя метады (тэхналогіі) навучання**

У ліку эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць прыцягненню студэнтаў да пошуку і кіраўніцтва ведамі, набыццю вопыта самастойнага вырашэння разнастайных задач, патрэбна вылучыць:

- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання,
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці,
- праектныя тэхналогіі,
- камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусія, прэсканферэнцыя, мазгавы штурм, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады),
- метад кейсаў (аналіз сітуацыі),
- гульневыя тэхналогіі, у рамках якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ралявых, імітацыйных гульнях, і інш.).

Для кіраўніцтва вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці мэтазгодна выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў,

варыятыўныя мадэлі самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

Мэтазгодна ўкараняць у практыку правядзення семінарскіх і практычных заняткаў методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы ў мэтах фармавання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка ВНУ.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў – мэтанакіраваная вучэбная дзейнасць студэнтаў, якая здзяйсняецца пад непасрэдным ці апасрэдаваным кіраўніцтвам выкладчыка.

Мэтай самастойнай работы студэнтаў з’яўляецца павышэнне канкурэнтназдольнасці выпускнікоў ВНУ праз фармаванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Кампетэнтнасны падыход прадугледжвае ўзмацненне практыкаарыентаванасці адукацыйнага працэса і ролі самастойнай дзейнасці студэнтаў па вырашэнні задач і сітуацый, якія імітуюць сацыяльна-прафесійныя праблемы. Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае выкананне кантрольных работ, падрыхтоўку рэфератаў, азнаямленне з навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, напісанне эсэ, курсавых работ, аналіз канкрэтных сітуацый і інш.

## Дыягностыка прафесійных і сацыяльна-асобасных кампетэнцый студэнта

Патрабаванні да правядзення дыягностыкі

- вызначэнне аб’екта дыягностыкі;
- выяўленне факта вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;
- вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням стандарта;
- ацэньванне вынікаў выяўлення і вымярэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням стандарта (з дапамогай шкалы ацэнак).

## Дыягнастычны інструментарый

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў пры прамежкавым і выніковым ацэньванні (залік, экзамен) рэкамендуецца выкарыстоўваць:

1) вусная форма: вусныя залікі, дыскусіі, апытанне;
2) пісьмовая форма: рэфераты, даклады, тэсты, рэцэнзіі;
3) вусна-пісьмовая форма: курсавыя работы з іх вуснай абаронай, залікі, экзамены;
4) тэхнічная форма: тэсты, прэзентацыі.

## ЛІТАРАТУРА

### Асноўная


1. АНАНЬЕВ В.Г. *История зарубежной музеологии: учеб.-метод. пособие*. Санкт-Петербург, 2014.
2. *Беларуская музеялогія. Біблягрaфічны паказальнік (1991–2012 гг.)* / укл. А.А. ГУЖАЛОЎСКІ [Электронный ресурс]. Мн., 2013. Рэжым доступу: http://elib.bsu.by/handle/123456789/33226.
3. ГОРБУНОВ И.В. *Искусство батальной диорамы в военно-исторических музеях СССР и СНГ во второй половине XX века*. Витебск, 2010.
4. *Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры*. Мн., 2016.
5. ЛОРД Б., ЛОРД Г. *Менеджмент в музейном деле*. М., 2002.
6. МАЙСТРОВСКАЯ М.Т. *Музейная экспозиция. Искусство – архитектура – дизайн. Тенденции формирования*. М., 2000.
7. *Музееведение. Музеи исторического профиля. Учебное пособия для ВУЗов по специальности «История»*. Под ред. К.Г. ЛЕВЫКИНА, В. ХЕРБСТА. М., 1988.
8. *Музеи Беларуси. Музеі Беларусі. Museums of Belarus*. Ред. совет: В. В. АНДРИЕВИЧ и др. Мн., Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018.
9. *Основы музееведения. Учебное пособие*. Под ред. Э.А. ШУЛЕПОВОЙ. М., 2009.
10. РЕШЕТНИКОВ Н.И. *Музееведение. Курс лекций*. М., 2000.
11. САПАНЖА О.С. *Теория музейной коммуникации. История, модели, стратегии, образовательные технологии. Учебное пособие*. Киров, 2017.
12. САФОНОВ А.А. *Музейное дело и охрана памятников: учебник и практикум для академического бакалавриата*. М., 2019.

13. Словарь музейных терминов. Учебно-методическое пособие. Сост. О. И. ЗАХАРОВА. Красноярск, 2013. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://structure.sfu-kras.ru/files/structure/docs/slovar_muzeynyh_terminov.pdf
14. СОТНИКОВА С.И. *Музеология. Учебное пособие для ВУЗов*. М., 2004.
15. СТОЛЯРОВ Б.А. *Музейная педагогика. История, теория, практика. Учебное пособие.* М., 2004.
16. ТЕЛЬЧАРОВ А.Д. *Основы музейного дела. Введение в специальность. Курс лекций*. М., 2005.
17. ШЛЯХТИНА Л.М., *Основы музейного дела: Теория и практика. Учебное пособие*. Спб., 2016.
18. ЮРЕНЕВА Т.Ю. *Музееведение. Учебное пособие*. М., 2003.
19. ЮХНЕВИЧ М.Ю. *Я поведу тебя в музей. Учебное пособие по музейной педагогике*. М., 2001.

## Дадатковая

1. *Авангардная музеология*. Под ред А. ЖИЛЯЕВА. М., 2015.
2. АНДРЕЕВА И.В. *Технология выставочной деятельности*. Челябинск, 2018.
3. ВАЙДАХЕР Ф. *Загальна музеологія: посібник*. Львів, 2005.
4. *Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь*. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.dkmf.by
5. КАЛБАСКА А.М. *Музейны дыярыўш ці Ўваходзіны ў новую музеялогію.* Мн., 2000.
6. КАЛУГИНА Т.П. *Художественный музей как феномен культуры*. Спб., 2001.
7. КОЗИЕВ В., ПОТЮКОВА Е. *Музей и общество*. Спб., 2015.
8. КОНСТАНТИНОВА С.С. *Экзамен по музееведению. Краткое пособие студенту.* М., 2005.
9. *Музееведческая мысль в России XVIII–XX вв.: сб. документов и материалов* / отв. ред. Э.А. ШУЛЕПОВА. М., 2010.
10. *Музеі Беларусі (Партал).* [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.museum.by
11. *Музеі Беларусі: Праблемы. Перспектывы. Інавацыі: Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць* / уклад., пер. з рускай мовы, агул. рэд. І.Б. ЛАПЦЁНАК. Мн., 2012.

12. *Музейное дело России*. Под ред. М.Е. КАУЛЕН. М., 2003.
13. *Музейны веснік / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі.* Мн., 2003–2008. Вып. 1–5.
14. ОБРИСТ Х.У. *Краткая история кураторства*. М., 2012.
15. ОПОЛОВНИКОВ А.В. *Музеи деревянного зодчества*. М., 1992.
16. *Первый национальный форум «Музеи Беларуси»: сб. материалов деловой программы, Гродно, 12–14 октября 2012 г.* / сост., под общ. ред. И.Б. ЛАПТЕНОК. Мн., 2013.
17. ПИОТРОВСКИЙ М.Б. *Для музеев нет табу. 50 статей за 10 лет.* СПБ., 2016.
18. ПИОТРОВСКИЙ М.Б. и др. *Философия музея*. Спб., 2014.
19. ПОЛЯКОВ Т.П. *Как делать музей?* М., 1997.
20. ПОЛЯКОВ Т.П. *Мифология музейного проектирования*. М., 2003.
21. *Российская музейная энциклопедия*. В 2 т. М., 2001.
22. СУДЖИЧ Д. *Язык вещей*. М., 2013.
23. ТАТАРИНОВ Ю. *Города Беларуси в некоторых интересных исторических сведениях: города-музеи.* Мн., 2016.
24. *Управление музеями. Музейная деятельность в XXI веке.* Спб, 2005.
25. ХАДСОН К. *Влиятельные музеи*. Новосибирск, 2002.
26. ЮРЕНЕВА Т.Ю. *Музей в мировой культуре*. М., 2003.
27. *International Council of Museums (ICOM)* [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.icom.museum